Выкарыстаная літаратура
1 Дубровенские! Это из Украины? // Беларуская ніва. – 2012. – 9 лют.
2. На ўзмежках цвіла і выстаяла. // Дняпроўская праўда –1982. – 23 каст.
3. Памяць. Гіст. дак. хроніка Дубровенскага раёна. У 2-х кн. Кн 1. – Мінск: Паліграфафармленне, 1997. – 598 с.
4. На ўзмежках цвіла і выстаяла. // Дняпроўская праўда –1982.– 2 лістап.
5. На ўзмежках цвіла і выстаяла. – “Дняпроўская праўда” – № 134, 11 лістап. 1982.
6. Болбас, М.Ф. Прамысловыя прадпрыемствы дарэвалюцыйнай Беларусі. – Мінск. Беларусь. – 221 с.
7. Беларусь: Энцыкл. даведнік / Беларуская Энцыклапедыя. Рэд. калегія: Б.І. Сачанка (гал. рэд.) і інш. – Мінск.: Беларуская Энцыклапедыя, 1995. – 800 с.
8. В центре Украины живут потомки дубровенцев. – http://www.dubrovno.by/&p7u55.Page7of8. Дата выхода 02.06.2013 г.
9. Гісторыя міст і сіл УССР. Дніпровська обласць. – Київ, 1969. – с. 260-265.

## ПЕРШАПРАХОДЗЕЦ ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСІ

*(да 130-годдзя з дня нараджэння акадэміка Ластоўскага В.Ю.)*

Арбузаў А.Ц., кандыдат гістарычных навук, дацэнт

Навуковай творчасцю акадэмік Вацлаў Юсцінавіч Ластоўскі пачаў займацца яшчэ да кастрычніка 1917 г. Яго першай кнігай быў падручнік для школы “Кароткая гісторыя Беларусі”, якую ён напісаў ва ўзросце 27 гадоў і ўпершыню апублікаваў на старонках газеты “Наша Ніва” у 1910 г. Пазней яна неаднаразова выходзіла з друку асобнай кніжкай.

Вацлаў Юсцінавіч Ластоўскі быў вельмі цікавым чалавекам, з’яўляўся не толькі гісторыкам і пісьменнікам, але і грамадскім і палітычным деячом. Ён актыўна ўдзельнічаў у беларускім нацыянальна-культурным адраджэнні.

У гады правядзення ў БССР палітыкі беларусізацыі быў рэпрэсіраваны і ў 1938 г. загінуў. Усе яго навуковыя працы былі

знішчаны альбо схаваны ў спецхраны, у тым ліку, яго падручнік “Кароткая гісторыя Беларусі”.

Прыклеены да вучонага ў 1930-я гг. ярлык “нацыяналіста і ворага народа” не дазваляў даследчыкам аб’ектыўна разглядаць яго шматбаковую дзейнасць на карысць культурнага адраджэння Беларусі. І нават цяпер аб В.Ю. Ластоўскім як гісторыку-першапраходцу, пісьменніку, грамадскаму дзеячу звестак не вельмі багата. Амаль паўстагоддзя яго імя ганьбавалася, крытыкавалася навуковая творчасць. У 1958 г. яго рэабілітавалі, але яшчэ ў 1972 г. ў 6-м томе “Беларускай Савецкай энцыклапедыі” Вацлаву Ластоўскаму даецца характарыстыка як ”гісторыку і публіцысту, аднаму з ідэолагаў беларускага нацыяналізму”, працам якога “уласцівы тэндэнцыйнасць і нацыяналістычная інтэрпрэтацыя гістарычных фактаў”. Ён “варожа ставіўся да марксізму, адмаўляў класавую барацьбу і кіруючую ролю пралетарыяту”. Такія фармуліроўкі былі ўключаны ў справу Ластоўскага В.Ю. падчас першага яго арышту 21. 7. 1930 г. і абвінавачвання ў стварэнні “Саюза вызвалення Беларусі” [1, с. 267, 418]. Пазней такія “абвінавачванні” старанна перапісваліся ў даследаваннях беларускіх вучоных. У гэтым можна пераканацца, калі заглянуць у 3-і том “Энцыклапедыі літаратуры і мастацтва Беларусі.” [27, с. 203]. А ў зводным каталогу “Кніга Беларусі 1517-1917 гг.”, выдадзеным у 1986 г., “Кароткую гісторыю Беларусі” В. Ластоўскага нават і не ўзгадалі [3, с. 112].

У творчым плане ён быў хутчэй паэтам, чым празаікам і вучоным. Паэтычнае “схіленне” гэтага празаіка ўпершыню падмеціў публіцыст Сяргей Палуян. Ён параўнаў В. Ластоўскага з М. Багдановічам і лічыў іх абодвух паэтамі, бо абразкі Власта – гэта паэзія прозы. У будучым, ён казаў, “абодва стануць у першым радзе нашых пісьменнікаў.” [6, с. 240]. І калі М. Багдановіч стаў класікам беларускай літаратуры яшчэ ў 20-е гг. XX ст., то крыху старэйшы яго сябра В. Ластоўскі толькі сёння на сваёй Бацькаўшчыне вяртаецца ў шэраг таленавітых пісьменнікаў і дзеячоў нацыянальнай культуры.

У гады гарбачоўскай перабудовы навуковец А.К. Каўка ў артыкуле “Паходня абуджанай памяці”, змешчаным у газеце “Літаратура і мастацтва”, прысвяціў некалькі абзацаў кнізе В. Ластоўскага “Кароткая гісторыя Беларусі”. Аўтар як бы

“абараняе” гісторыка і, пераадолеўшы ідэалагічныя штампы, нагадвае, што русіфікатарскі орган “Окраина России” атакаваў вучонага за акцэнтаванне старадаўняга беларускага пісьменства, паколькі, маўляў, ніякай беларускай мовы ў мінулым не было, а таксама за тое, што ў кнізе не знойдзена “портретов ни императара Александра II, ни графа М.Н. Муравьева, ни митрополита Иосифа Семашки”. Замест іх у кнізе змешчаны партрэты Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча, Францішка Багушэвіча, Янкі Лучыны.

Вацлаў Ластоўскі – адна з самых загадкавых асобаў у гісторыі Беларусі. Яго палітычныя, філасофскія, літаратурна-эстэтычныя погляды, урэшце, яго пісьменніцкі, навуковы і грамадскі воблік не паддаюцца адназначным характарыстыкам. “Калі дазволіць сабе карыстацца вядомымі архетыпамі, – казаў Уладзімір Конан, – Вацлаў Ластоўскі – гэта Праметэй беларускага “нашаніўскага” і ранняга эмігранцкага нацыянальнага Адраджэння. Ён народны мудрэц і прарок, гісторык і публіцыст, журналіст і мастацтвазнаўца, урэшце, палітык і нават падпольшчык-рэвалюцыянер” [6, с. 239].

Больш падрабязна пра В.Ю. Ластоўскага пасля яго рэабілітацыі напісаў літаратурны крытык А. Сідаровіч. У сваім артыкуле, надрукаваным у 1988 г. у часопісе “Нёман”, ён прыводзіць шмат біяграфічных звестак пра В.Ю. Ластоўскага як чалавека, малавядомага для шырокіх колаў [26, с. 156-161]. У 1990 г. у кнізе Барыса Сачанкі ”Сняцца сны аб Беларусі” быў апублікаваны нават яго амаль поўнамаштабны біяграфічны нарыс.

Вацлаў Юсцінавіч Ластоўскі нарадзіўся 8 лістапада (27 кастрычніка) 1883 г. у засценку Калеснікава Дзісненскага павета Віленскай губерні (зараз Глыбоцкі раён Віцебскай вобласці) у сям’і земляроба-арандатара [1, с. 598]. Першапачатковую адукацыю атрымаў у вёсцы Стары Пагост у школе, адкрытай яшчэ ў 1721 г. Як успамінае сам Ластоўскі В.Ю у артыкуле ”Старапагоская вясковая школа”, ”школка ў Старым Пагосце ўяўляла сабой убогае відовішча і ставіла перад сабой мэту навучыць дзяцей маліцца, умець падпісацца і авалодаць элементарнымі дзеяннямі па арыфметыцы. Але выкладовай мовай была мова беларуская. Ня было нават спробы гаварыць іншай мовай”. Гэтым самым Ластоўскі В.Ю. падкрэсліваў думку, што менавіта сялянскія жыхары захавалі родную мову, сваю нацыю, нягледзячы на дрэнны стан адукацыі і наступ палітыкі царызма. Пасля заканчэння пачатковай

парафіяльнай школкі вучыўся ў Дзісненскім павятовым вучылішчы [5, с. 8, 93, 149].

Юнацтва будучага прэм’ер-міністра Беларускай Народнай Рэспублікі (БНР) можна пазначыць пункцірна і непаслядоўна: з 1896 г. хлопчык на паслугах у Віленскай віннай краме, затым канцылярыст нейкай казённай установы ў Шаўляі. Але юнака вабіла навука і ён ад’ехаў у Пецярбург, дзе працаўладкаваўся бібліятэкарам прыватнай студэнцкай бібліятэкі і адначасова “зайцам” слухаў лекцыі ў мясцовым універсітэце. У 1903 г. уступіў у шлюб з літоўскай дзяўчынай Марыяй Іваноўскай. Яна была старэйшай за яго на 11 год і таксама працавала ў Пецярбургу ў грамадскай чытальні. Жылі ў бядноце і таму жонка падзарабляла на хлеб, у асноўным, як швачка [5, с. 93; 8, с. 149; 1, с. 149].

У хуткім часе Ластоўскі з Марыяй пераехалі ў Літву ў мястэчка Парагяй – на радзіму жонкі. Там у сям’і нарадзіліся 2 дачкі. У вольны час Марыя займалася літаратурнай дзейнасцю і стала пазней вядомай пісьменніцай. У літоўскай літаратуры выступала пад псеўданімам Пяледа. У будучым пастановай Асобай нарады пры НКВД СССР 15 красавіка 1938 г. яна была асуджана як член сям’і здрадніка Радзімы да 8 гадоў “папраўна-працоўных” лагераў. Памерла 19 ліпеня 1957 г. [11, с. 264].

З 1902 г. В. Ластоўскі – сябра Польскай партыі сацыялістаў (ППС), якая дзейнічала на тэрыторыі былога Вялікага княства Літоўскага. Партыя выдавала пракламацыі і брашуры на беларускай, польскай, рускай і яўрэйскай мовах. ППС ставіла мэтай стварэнне краявой дэцэнтралізаванай партыі, беларуска-літоўскай аўтаноміі (княства) у складзе польскай дзяржавы, але з устаноўчым сходам у Вільні.

Праз чатыры гады Ластоўскі В.Ю. памяняў сваю палітычную арыентацыю, адмежаваўся ад польскага нацыянальна-вызваленчага руху і актыўна ўключыўся ў справу нацыянальна-культурнага адраджэння Беларусі. У 1906 г. з сям’ёй пераехаў у Рыгу і ўступіў у Беларускую сацыялістычную Грамаду, у складзе якой быў да 1908 г.

У Рызе Ластоўскі В.Ю. спрабаваў здаць экзамены на атэстат сталасці, аднак, паводле ўласных слоў, ”зрэзаўся” на расійскай мове. Рыжскія экзамены паклалі канец безвыніковым спробам атрымаць пацвярджэнне сваім ведам у выглядзе дыплома ці

атэстата. Ластоўскі В.Ю. па-ранейшаму стаў зацята працаваць і паглыбляць прыродны розум нястомнай самаадукацыяй [8, с. 149].

У сакавіку 1909 г. Ластоўскі В.Ю. працаўладкаваўся ў Вільні сакратаром рэдакцыі газеты БСГ ”Наша Ніва”, якая ў той час ператварылася ў інфармацыйны цэнтр беларускага нацыянальна-культурнага адраджэння. На яе старонках упершыню ўбачылі свет паэмы Я. Купалы “Курган” і “Бандароўна”, урыўкі з паэмы Я. Коласа “Новая зямля”.

У 1910 г. Янка Купала ў Вільні прысвяціў Вацлаву і Марыі Ластоўскім верш ”Песня званара”. Сведчанні адносінаў Я. Купалы да В.Ю Ластоўскага сціплыя, але верш, што з’явіўся ў “Нашай Ніве” 30 верасня 1910 г., быў знакам павагі і ўдзячнасці [13,с. 158]. Паэт пісаў:

“Так даўно ў нас не йгралі.
Дзіў адно плыве і чар
Шторaз вышай, штораз далей,
Знаць, бывалы ён дудар” [14, с. 132].

На старонках “Нашай Нівы” друкаваліся творы Ц. Гартнага,З. Бядулі, А. Уласава, М. Багдановіча, А. Гурло, К. Буйло і іншых дзеячоў беларускага адраджэння. Менавіта ў публікацыях на нашаніўскіх старонках праявіўся вялікі талент В. Ластоўскага як публіцыста, гісторыка і пісьменніка. ”Наша Ніва” адыграла вялікую ролю ў выяўленні і збіранні нацыянальных навуковых і літаратурных сіл, выданні і прапагандзе беларускіх кніг, развіцці беларускай публіцыстыкі і літаратурнай крытыкі. Газета шмат увагі ўдзяляла тэарэтычнаму абгрунтаванню права беларускага народа на захаванне і развіццё сваёй мовы і нацыянальнай культуры. Яна абвяргала думку, быццам гістарычны працэс непазбежна вядзе да зліцця меншых народаў з большымі, і выступіла з ідэяй еднасці ўсіх беларусаў, незалежна ад іх веравызнання.

У “Нашай Ніве” В. Ластоўскі цалкам стаяў на баку інтарэсаў беларускага народа, паслядоўна выступаў за яго дзяржаўную самастойнасць. Ён неаднаразова заяўляў, што Беларусь можа знайсці выратаванне толькі ў нацыянальным адраджэнні сваёй краіны. ”Трэба думаць пра выратаванне нацыі і кожны народ павінен патурбавацца сам за сябе”. У выніку дзейнасці В. Ластоўскага ў “Нашай Ніве” павялічыўся лік нацыянальна

свядомай інтэлігенцыі, якая згуртавалася вакол газеты, і тым самым быў закладзены падмурак нацыянальнага адраджэння беларусаў.

У час рэдактарства Ластоўскага “Наша Ніва” выказвалася за ўвядзенне на Беларусі земстваў, station ставілася да хутарызацыі, арганізацыі вытворчых, крэдытных, гандлёвых, асветных і іншых суполак. Газета адстойвала грамадзянскае і палітычнае раўнапраўе беларускага народа, выступала супраць вялікадзяржаўнай палітыкі царызму і шавінізму польскіх абшарніцка-клерыкальных колаў, за права свабодна карыстацца роднай мовай, развіваць на ёй нацыянальную культуру і асвету [4, с. 125].

Пачатак XX ст. увогуле даў беларускаму адраджэнню, акрамя В. Ластоўскага, вялікую колькасць магутных асоб, якія вылучаюцца ў нацыянальным руху, паказваючы не толькі сучаснікам, але і наступнікам шлях наперад. Гэта Іван і Антон Луцкевічы, Янка Купала і Якуб Колас, Карусь Каганец, Сяргей Палуян, Цётка, Максім Гарэцкі, Алесь Гарун, Адам Станкевіч, Францішак Аляхновіч, Максім Багдановіч, Браніслаў Тарашкевіч, Язэп Лёсік і інш. Але, безумоўна, цэнтральнае, пачэснае месца ў беларускім нацыянальным руху належыць В.Ю. Ластоўскаму: палітычнаму дзеячу і асветніку, гісторыку і літаратуразнаўцы [5, с. 92].

З пачаткам Першай сусветнай вайны і набліжэннем германска-расійскага фронта 7(20) жніўня 1915 г. газета “Наша Ніва” спыніла сваё выданне. Вялікая частка беларускіх зямель апынулася ў зоне нямецкай акупацыі. В. Ластоўскі застаўся ў Вільні і рэдагаваў газету “Гоман”, дзе, у прыватнасці, быў змешчаны яго артыкул, прысвечаны Кастусю Каліноўскаму. Ен таксама пісаў вершы, п’есы. У 1916 г. Ластоўскі В.Ю. выдаў невялікую па аб’ёму, але вельмі каштоўную кніжку “Першае чытанне. Кніжыца для беларускіх дзетак дзеля навукі чытання”. У ёй ён імкнуўся пашырыць дзіцячы кругагляд, выхаваць любоў да Бацькаўшчыны, да яе прыроды, гісторыі і культуры.

“Але свядомага грамадзянства ў нас няма, – адзначаў В. Ластоўскі, – Бацькаўшчына наша спіць непрабудным сном”. У газетах ”Наша Ніва”, “Гоман”, часопісе “Крывіч” ён выступаў з літаратурнымі нарысамі і рэцэнзіямі на першыя кніжкі мастацкай прозы Якуба Коласа, Максіма Гарэцкага і іншых пісьменнікаў. Гэта ён адкрыў Максіму Багдановічу багатую гісторыю і культуру беларусаў, дапамог выдаць адзіны прыжыццёвы зборнік паэта

“Вянок” і даў яму назву [18, с. 92]. Як літаратуразнаўца, ён прытрымліваўся думкі, што да гісторыі беларускай мастацкай культуры трэба залічваць “усе творы зямлі і народу нашага, нягледзячы на тое, якой мовай і дзе яны тварылі” [6, с. 248].

У 1916-1918 гг. В.Ю. Ластоўскі актыўна займаўся зборам фальклору. Ён лічыў, што вяскоўцы заўсёды былі багатыя на сваю творчасць, сатырычнае слова, якое ніколі не памірала ў народзе. У выніку выйшаў зборнік яго запісаў “Прыпеўкі: (Песні-песень)”, а таксама падрыхтаваныя творы, прысвечаныя актуальным пытанням гісторыі адукацыі на Беларусі – “Віленская грэка-лацінска-руская Акадэмія”, “Старапагоская вясковая школа”, пазней надрукаваныя ў часопісе “Крывіч”. Артыкул у гэтым выданні “Да шукання крыніц народнай творчасці” быў прысвечаны беларускаму фальклору як важнейшаму літаратурнаму жанру, які дапамагаў выхоўваць у дзяцей нацыянальную самасвядомасць, павагу да духоўнай спадчыны. На думку аўтара, народнае мастацтва і літаратура квітнеюць у шчаслівыя часы росквіту этнасу і занепадаюць ва ўмовах палітычнай і культурнай экспансіі з боку імперскіх нацый. “Калісьці – пісаў В.Ю. Ластоўскі, – беларускія вышыўкі і тканіны па малюнку і падбору колераў не ўступалі найдалікатнейшым японскім вырабам. Здаўна ў Беларусі іголка і чаўнок канкурыравалі з пяром і пэндзлем. Задача выставак – адрадзіць гэтае мастацтва, бо разам з ім уваскрэсне душа народа, адновіцца яе здольнасць да выяўлення жывой красы роднага краю, яго духоўных традыцый” [6, с. 247].

Фундаментам самабытнага нацыянальнага стылю ў культуры з’яўляецца, на думку В. Ластоўскага, аўтэнтычная народная творчасць – мова, фальклор, традыцыйныя святы і абрады. У купальскіх абрадах ён бачыў беларускі аналаг алімпійскім гульням старадаўняй Грэцыі. У калядных абрадах ён бачыў глыбінны пачатак нацыянальнага тэатра і беларускай оперы, у пэўным сэнсе адэкватных дыянісійскім і арфічным святам старажытнай Грэцыі [6, с. 244, 245]. Ён рабіў выснову пра неабходнасць захоўваць і развіваць усе правы “беларускай асобнасці”, арыгінальнасці, дзе б яна не сустракалася – у арнаментах, народных кроях, песнях, у мове, паэзіі, мастацтве.

Разнастайнасць жанравага матэрыялу – прыказкі, прымаўкі, загадкі, казкі, лірычныя вершы пра родны край – характарызуе

асветніцкі напрамак творчасці аўтара. Свой выхаваўчы погляд ён накіроўваў галоўным чынам на дзіцячы ўзрост і сцвярджаў, што “далейшая навука чытання шмат у чым залежыць ад настаўніка, ад першапачатковага навучання, у якім трэба больш увагі звяртаць на развіццё вуснай мовы, на гукавымаўленне, на мілагучнасць мовы, каб дзеці са слоў настаўніка разумелі, чаго ад іх хочуць”. Разуменне вучнем таго, пра што гаворыць педагог, матывацыйныя дзеянні дзяцей, на думку В. Ластоўскага, адно з галоўных педагагічных і метадычных аўтарскіх патрабаванняў. Для навучэнцаў беларускіх школ ён склаў падручнікі “Першае чытанне. Кніжыца для беларускіх дзетак дзеля навукі чытання”, “Незабудка”, “Сейбіт”, “Выпісы з беларускай літаратуры, ч. 1”, “Кароткая гісторыя Беларусі” і інш.[1, с. 418].

Над схіленнем настаўнікаў на шлях нацыянальна-культурнага адраджэння шмат папрацавалі і такія вядомыя беларускія паэты, як К. Каганец, Цётка, Я. Колас і інш., якія таксама пісалі для дзяцей творы, умела аздабляючы іх гукамі і фарбамі роднага краю. Але В.Ю. Ластоўскі выпрацаваў яшчэ адзін каштоўны накірунак – выхаванне ў падрастаючага пакалення нацыянальнай гістарычнай самасвядомасці.

В. Ластоўскі лічыў, што агульначалавечыя каштоўнасці павінны выхоўвацца ў маладога пакалення ў школе, сям’і і грамадстве праз сродкі нацыянальнага самавызначэння. Ён сцвярджаў, што “ні адзін народ не стаіць на такім страшным бездарожжы нацыянальна-духоўнага жыцця і палітычнага бяспраўя, як мы, беларусы.” У той складаны і адказны час, калі Беларусь, як па-жывому, была падзелена на дзве часткі, В. Ластоўскі настойліва заклікаў лепшых сыноў шматпакутнай Радзімы не стаяць на бездарожжы, гадаючы, “якія новыя ланцугі прынясе яму заўтрашні дзень,” а аб’яднацца і прыйсці на дапамогу свайму народу, “прыйсці правадырамі і павесці свой народ да нацыянальнага самавызначэння”.

У пачатку 1918 г. ён стварыў у Вільні арганізацыю “Сувязь незалежнасці і непадзельнасці Беларусі”, якая выпрацавала галоўныя напрамкі стварэння незалежнай Беларусі. Арганізацыя аб’яднала ў асноўным каталіцкае духавенства беларускіх зямель, якое мела сувязі з нямецкай каталіцкай партыяй цэнтра. Не цяжка заўважыць, што В. Ластоўскі выкарыстоўваў усё магчымае, каб дамагчыся незалежнасці Беларусі, але адначасова ён выступаў

супраць якіх-небудзь спроб утварыць Беларускую дзяржаву разам з Польшчай ці Літвой. Менавіта таму ў гады нямецкай акупацыі ён завочна 18 сакавіка 1918 г. быў кааптаваны ў склад Рады Беларускай Народнай Рэспублікі ў Мінску. Праз 5 дзён пасля прыезду ў Мінск В. Ластоўскі ўдзельнічаў у паседжанні Рады БНР, якая 25 сакавіка 1918 г. трэцяй статутнай граматай абвясціла БНР "незалежнай, вольнай дзяржавай". Нягледзячы на тое, што В. Ластоўскі не падпісаў вядомую тэлеграму на імя германскага імператара Вільгельма II, ён у той жа час не бачыў магчымасці супрацоўніцтва з бальшавіцкім кіраўніцтвам Заходняй вобласці. Такога пункту погляду Ластоўскі прытрымліваўся пасля разгону бальшавікамі Усебеларускага з'езду ў Мінску ў ноч з 17 на 18 снежня 1917 г. [3, с. 113, 114].

У лістападзе 1918 г. у Германіі адбылася рэвалюцыя, савецкі ўрад дэнансаваў Брэсцкі дагавор і Чырвоная Армія рушыла на захад. Рада БНР пасля адыходу германскага войска аказалася безабароннай.Частка яе членаў засталася ў Мінску, астатнія выехалі ў Вільню і Гродна. У 1919 г. В. Ластоўскі ўступіў у Беларускую партыю сацыялістаў-рэвалюцыянераў (эсэраў), быў гарачым прыхільнікам і адным з галоўных ідэолагаў незалежнасці Беларусі. З снежня 1919 г. ён старшыня Рады міністраў Беларускай Народнай Рэспублікі, а з 1920 г. – прэм'ер-міністр эмігранцкага ўрада.

Пасля канчатковага вызвалення Беларусі ад нямецкай акупацыі ўрад БНР на чале з Ластоўскім В.Ю. здолеў знайсці палітычны прытулак сярод краін-суседак толькі ў сталіцы Літвы г. Коўна. Знаходзячыся ў эміграцыі, Ластоўскі наведаў Бельгію, Германію, Ватыкан, Італію, Чэхаславакію, Францыю, Швейцарыю і ўсюды выступаў у абарону правоў беларускага народа, асабліва на тэрыторыі Заходняй Беларусі. На кожным урачыстым прыёме, міжнароднай канферэнцыі, нарадзе, сімпозіўме ён выступаў ад імя Беларусі як сапраўдны беларус і дзеля будучыні сваёй Бацькаўшчыны. Кожны здзек з беларускага народу, тэрыторыя якога ў 1921 г. у Рызе была распілавана мяжою, ён расцэньваў як здзек з яго самога, прэм'ера БНР.

Ніякія перашкоды не маглі пазбавіць В. Ластоўскага права грамадзяніна, узгадаванага на вялікай любові да роднага народа, выступаць у абарону зняволеных і пагарджаных, у абарону беларускага народа.

Так, у жніўні 1924 г. у Жэневе В. Ластоўскі падаў у Раду Лігі Нацый мемарандум, у якім выказваўся пратэст супраць учыненага польскімі ўладамі судовага працэсу над групай беларускіх эсэраў на чале з Сяргеем Баранам і Верай Маслоўскай-Матэйчук (г. зв. ”працэс 45-ці). Падчас знаходжання ў Парыжы Ластоўскі В.Ю. стаў адным з ініцыятараў стварэння Камітэта Прыгнечаных Нацый, дзейнасць якога планавалася накіраваць у абарону нацыянальных меншасцяў у Польшчы [12, с. 155].

З 1923 па 1927 гг. В. Ластоўскі жыў у г. Коўна пад крылом “Тарыбы”, якая не толькі дазволіла ўтварыць Беларускі цэнтр у Літве, але і фінансавала часопіс “Крывіч”, які па разнастайнасці тэматыкі артыкулаў не ўступаў ніводнаму перыядычнаму выданню Савецкай Беларусі.

Беларускі літаратурна-навуковы і грамадскі часопіс “Крывіч” рэдагаваўся В. Ластоўскім і К. Дуж-Душэўскім. Было выдадзена 12 нумароў. На яго старонках публікаваліся творы на самыя розныя тэмы і, перш за ўсё, шмат артыкулаў самога Ластоўскага, якія падпісваліся пад псеўданімамі Арцём Музыка, Власт, Юры Верашчака і інш. Амаль у кожным нумары былі яго вершы [12, с. 163, 154].

У 1924 г. на старонках часопіса “Крывіч” з’явіліся творы В. Ластоўскага “Віленская грэка-лацінска-руская Акадэмія”, ”Расійска-крыўскі (беларускі) слоўнік” і “Гісторыя беларускай (крыўскай) кнігі”, у якой дадзена апісанне манускрыптаў і друкаваных выданняў ад канца X да пачатку XIX стст. Годам раней былі надрукаваны артыкулы “Старапагоская вясковая школа” і “Да шукання крыніц народнай творчасці” [10, с. 200, 201].

Як нашчадак полацкіх крывічоў, Ластоўскі быў асобай моцнай і цэльнай, здольнай на рашучыя, нават авантурныя ўчынкі. Яго смела можна назваць пачынальнікам беларускага фундаменталізма. Ён лічыў, што Беларусь гэта Крывія, стварылася яна яшчэ ў дахрысціянскія вякі як вялікая дзяржава і ахоплівала значную частку ўсходнеславянскіх плямёнаў і летапісную Літву. Такі фудаменталізм выявіўся затым і ў стылістыцы і лексіцы пісьменніка.

У кнізе “Гісторыя беларускай (крыўскай) кнігі” В.Ю. Ластоўскі ўпершыню выклаў свой погляд на галоўную прычыну згоды ВКЛ на ўтварэнне Рэчы Паспалітай. Ён тлумачыў гэта рэфармацыяй у

Еўропе, якая насіла цывілізацыйны антыфеадальны характар і таму лічыў, што ВКЛ павярнулася ў бок цывілізацыі. Вялікае княства Літоўскае было велізарнай дзяржавай, грознай для суседзяў, але не мела ні агульнай гістарычнай традыцыі, ні адзінай веры, ні аднароднай жывой мовы. Рэфармацыя, на думку В Ластоўскага, з'явілася галоўным віноўнікам паланізацыі беларускага грамадства ў XVI ст., бо да таго часу ўплыў польскай культуры і мовы быў нязначным. "Рэфармацыя магла даць сапраўднае адраджэнне крыўскаму народу, калі б яна (рэфармацыя) абапіралася на народную мову, пад лозунгам вызвалення... з-пад уплыву мёртвай царкоўнай балгаршчыны" [6, с. 254].

Адной з малавядомых старонак разнастайнай грамадска-палітычнай, нацыянальна-культурнай і навукова-асветніцкай спадчыны Ластоўскага з'яўляецца яго педагагічная дзейнасць, таму ёй ў 1990-х гг. была нададзена вялікая ўвага на Міжнародных навуковых канферэнцыях у Маладзечна, Наваполацку і Вільнюсе. У дакладах аналізаваліся яго падручнікі "Кароткая гісторыя Беларусі", "Першае чытанне. Кніжыца для беларускіх дзетак дзеля навукі чытання", выдадзеныя ў дакастрычніцкі час, іх уплыў на выхаванне самасвядомасці беларускіх дзяцей. У сувязі са святкаваннем 110-годдзя з дня нараджэння В.Ю. Ластоўскага толькі на канферэнцыі ў Наваполацку выступілі 30 вучоных з Беларусі, Літвы, Польшчы і Расіі [16, с. 6, 7].

Ластоўскі хацеў стварыць новую, багатую і слаўную гісторыю сваёй Бацькаўшчыны. Асвятленнем гістарычнага мінулага нашай краіны займаліся навукоўцы і да яго. Але даследчыкі, якія браліся за гэтую справу, былі альбо расійскія, альбо польскія. Вядома, яны выконвалі сацыяльны заказ пануючых колаў Расіі і Польшчы, таму адмаўлялі беларусам у існаванні самастойнага ўсходнееўрапейскага славянскага этнасу, не прызнавалі існаванне дзяржаўнасці на беларускіх землях, самастойнасці мовы, культуры. Расійскія гісторыкі разглядвалі Беларусь як Паўночна-Заходні край, Заходнюю Русь; польскія – як "крэсы ўсходнія", "Белапольшчу", паўночна-ўсходнія землі Польшчы, адны і другія лічылі беларускія землі часткай этнічнай тэрыторыі Расіі або Польшчы, а беларускую мову – дыялектам рускай або польскай мовы. У выніку атрымоўвалася тэндэнцыйная, аднабаковая карціна, з'явіліся спачатку вялікаруская, а затым і вялікапольская канцэпцыі паходжання беларускага этнасу.

“Кароткая гісторыя Беларусі” была напісана з пункту гледжання беларускіх нацыянальных інтарэсаў, “з становішча карысьцей і шкод беларускага народу”. Аўтар праўдзіва сцвярджаў, што беларусам адбудову свайго жыцця “трэба пачаць з фундаменту, каб будынак быў моцны” [3, с. 5], фундаментам жа ён лічыў гісторыю Бацькаўшчыны і таму з вялікай павагай ставіўся да беларускага народа як самабытнага этнасу шматпакутнай зямлі, што амаль 200 гадоў была “вечным ваенным боішчэм”.

В. Ластоўскі ўпершыню паказаў беларускі народ не толькі як аб’ект уздзеяння з боку суседзяў, але і як суб’ект гістарычнага працэсу, творцу свайго лёсу. У гэтым крыецца вялікая выхаваўчая сіла яго маленькай кніжкі не толькі з пункту гледжання нацыянальнай свядомасці, але і з пазнавальнага боку для тагачаснага, сучаснага і наступных пакаленняў.

Яго “Кароткая гісторыя Беларусі” – “гэта першая папулярная гісторыя Беларусі, напісаная сапраўдным беларусам і для беларусаў” [3, с. 111]. Яна дапамагла вельмі многім жыхарам беларускіх зямель далучыцца да сапраўднай, слаўнай гісторыі роднага краю. У ёй шмат месца адведзена пытанням беларускай дзяржаўнасці. В. Ластоўскі значна раней за Ермаловіча М.І. адзначыў, што літоўскія князі, заснавальнікі Вялікага княства Літоўскага, былі полацка-крывічскага паходжання [3, с. 15, 16]. Выступаючы супраць гістарычнага беспамятства, Ластоўскі сваю кнігу найперш прысвячаў “сынам маладой Беларусі”, каб яны змаглі пазнаць мінуўшчыну сваёй Бацькаўшчыны на роднай мове, сфарміраваць у сабе трывалую нацыянальную самасвядомаць і годнасць сапраўднага гаспадара сваёй зямлі. Змест падручніка прасякнуты ідэяй набыцця гістарычных ведаў ад нацыянальнага да агульначалавечага, што садзейнічала выхаванню ў дзяцей пачуццяў патрыятызму, гонару за сваю Радзіму і за сябе як яе суб’екта.

Пасля “Кароткай гісторыі Беларусі” (1910 г.) другім падручнікам з’явілася ”Першае чытанне. Кніжыца для беларускіх дзетак дзеля навукі чытання”, выдадзеная ў 1915 г. у Вільні. Затым у 1916 г. ён выдаў чытанку “Родныя зярняты” для другога і трэцяга класаў [6, с. 256, 257]. У далейшым Ластоўскі працягваў працу па стварэнню і выданню вучэбнай літаратуры: у 1918 г. з’явіліся кнігі для чытання “Незабудка” і “Сейбіт”, а таксама працы “Што трэба ведаць кожнаму беларусу” і “Выпісы з беларускай літаратуры”

(ч. 1). Апошняя з'яўляецца першай хрэстаматыяй па гісторыі беларускай літаратуры, мовы. Галоўнай каштоўнасцю гэтых кніг з'явілася тое, што яны вучаць думаць, стымулююць развіццё самастойнасці, фарміруюць здольнасць свабодна карыстацца запасам ведаў. У своеасаблівым маральным кодэксе "Што трэба ведаць кожнаму беларусу" значнае месца займае агляд беларускай мовы: "Родная мова – вялікае народнае багацце, якое народ павінен высока цаніць і шанаваць!" [7, с. 3].

Беларуская мова разглядваецца ім як самабытная, адна з самых культурных і старажытных моў. Беларусы могуць і павінны ганарыцца сваім пісьменствам, літаратурай, якія з'яўляюцца старэйшымі, чым польскія і расійскія. В. Ластоўскі дакладна і навукова тлумачыў, што беларускі народ мае сваю зямлю, дзе самім Богам вызначана ў цэнтры Еўропы яго месца пражывання, самастойную мову, гісторыю, адметную ад іншых культуру, свае звычаі, склад жыцця, асобны фізічны і духоўны тып.

У прадмове да свайго "Расійска-крыўскага (беларускага) слоўніка" (1924 г.) В. Ластоўскі разгледзеў у мове ўніверсальную народную творчасць, дзе кожнае слова – шматзначны мастацкі вобраз, у якім зашыфраваны пэўны аспект шматвяковай культуры: "Увесь светапогляд і паэзія нашых прадзедаў замыкаліся ў мове". Сваю задачу даследчык роднага слова бачыў у тым, каб захоўваць першародную чысціню яе, аберагаць ад разбуральных іншамоўных уплываў.

В. Ластоўскі тлумачыў паняцце патрыятызму як найперш свой духоўны росквіт "праз сям'ю і школу і праз грамадскую працу", якія з'яўляюцца для беларуса не толькі правам, але і абавязкам. "Патрыёт-беларус, – адзначаў Ластоўскі, – павінен клапаціцца пра адкрыццё пачатковых, сярэдніх і вышэйшых нацыянальных школ, бо калі "сям'я – гэта аснова, фундамент нацыі", то "школа – будучыня яе" [7, с. 3, 23, 35, 345].

Ён быў гатовы супрацоўнічаць з кожным, хто мог дапамагчы стварыць беларускую дзяржаўнасць і захаваць яе тэрытарыяльную цэласнасць. У імя Беларусі і дзеля будучыні Айчыны Ластоўскі ішоў на супрацоўніцтва з усімі партыямі, рухамі, урадамі. Але ў змаганні за незалежную Беларусь ён не заўсёды знаходзіў паразуменне і падтрымку нават сярод сваіх бліжэйшых паплечнікаў. Так, рознае станаўленне да Польшчы прывяло да расколу членаў

урада БНР. В. Ластоўскі са сваімі аднадумцамі правёў у 1919 г. у Мінску нелегальную канферэнцыю, дзе быў выказаны недавер польскім уладам, утварыў новы ўрад – Народную Раду БНР. Луцкевіч А.І. са сваімі аднадумцамі, якія прыхільна ставіліся да федэрацыі з Польшчай, склалі Найвышэйшую Раду БНР. Члены кабінета Міністраў Народнай Рады БНР і сам Ластоўскі неўзабаве былі арыштаваны польскімі ўладамі. Пасля вызвалення ён пераехаў у Коўна – тагачасную сталіцу Літвы, дзе Народная Рада аднавіла сваю дзейнасць і арганізавала партызанскі рух супраць белапалякаў.

Летам 1921 г. кіраўніцтва Беларускай партыі сацыял-рэвалюцыянераў, у склад якога ўваходзіў Ластоўскі, узяло курс на падрыхтоўку ўзброеннага паўстання. Быў створаны Галоўны Штаб беларускіх партызан. Штаб прытрымліваўся ідэалагічнай платформы беларускіх эсэраў, якія імкнуліся да незалежнасці Беларусі, і быў цесна звязаны з урадам БНР Ластоўскага, што знаходзіўся ў Коўна. Беларуская партыя сацыял-рэвалюцыянераў (беларускія эсеры), на чале якой стаялі П. Бадунова, Ф. Грыб, В. Ластоўскі, Я. Мамонька, А. Цвікевіч і іншыя, мела свой друкаваны орган – газету “Наша будучыня” і ставіла сваёй мэтай утварэнне незалежнай Беларускай дэмакратычнай рэспублікі на ўсіх беларускіх землях [1, с. 383, 384, 386].

На чале ўрада БНР Ластоўскі быў да 1923 г. Ён падаў у адстаўку і яго змяніў А. Цвікевіч. Рада і ўрад БНР пераехалі ў Прагу. В. Ластоўскі застаўся ў Коўна і актыўна заняўся навуковай дзейнасцю. Ён склаў руска-беларускі матэматычны слоўнік, падрыхтаваў фундаментальную гісторыю беларускай кнігі.

Яго сучаснік і паплечнік К. Езавітаў у свой час ахарактарызаваў Ластоўскага В.Ю. не лепшым палітыкам, хутчэй, лічыў яго нацыянальным дзеячом у лепшым сэнсе гэтага слова, таму ён не здолеў паразумецца з палітыкамі і прайграў. “З прычыны асаблівага складу свайго характару, – пісаў К. Езавітаў, – ён не быў і не мог быць за выдатнага палітыка. Гэта быў чулы і просты чалавек, паэт і навуковец. Троху мастак, якога цягнула да ціхай і пладавітай кабінетнай працы ў адзіноце, калі асабліва ясна працуе галава і шчыра адчыняецца сэрца для глыбокіх пачуццяў любові да Бацькаўшчыны” [17, с. 205].

Інтэлігенцыя Заходняй Беларусі прыкладала шмат намаганняў у справе навуковага даследавання нацыянальнай гісторыі і культуры.

Сярод шэрагу розных арганізацый, працаваўшых у гэтым накірунку, было Беларускае навуковае таварыства (БНТ), ля вытокаў якога ў 1921-1939 гг. стаялі В. Ластоўскі, браты І., А. Луцкевічы і інш. Таварыства дзейнічала ў Вільні. Актыўныя дзеячы БНТ спачатку займаліся распрацоўкай беларускай навуковай тэрміналогіі, перакладам на беларускую мову педагагічнай, мастацкай і іншай літаратуры. Але галоўнай мэтай таварыства, вызначанай яго статутам, была "living" "рознабаковая навуковая праца, развіццё любові да навуковых доследаў і пашырэнне ведаў" [18, с. 1]. "Мы, – пісаў В. Ластоўскі, – народ малады і здаровы, павінны тварыць сваю асобную, дужую маладой сілай літаратуру будучыні. Нашы пісьменнікі павінны выраблядь талент свой не на дэкадэншчыне, а на сусветнай класічнай літаратуры; павінны раскрываць раны свайго грамадства і паказваць яго калецтвы, але і шукаць чалавека будучыні, чалавека сільнага, здаровага, чалавека – цара прыроды. Мы павінны шукаць і знайсці новы шлях і паказаць яго тым, хто дагэтуль, на гарах ходзячы, не бачаць сонца" [6, с. 250].

У лістападзе 1926 г. у Мінску па ініцыятыве Інбелкульта адбылася акадэмічная канферэнцыя па рэформе беларускага правапісу. З гэтай нагоды ў Мінск прыбылі і вядомыя дзеячы беларускай навукі і культуры, якія па самых розных прычынах апынуліся па-за межамі сваей Радзімы. Сярод іншых навукоўцаў на заклік уздыму культурнага будаўніцтва, ажыцяўлення палітыкі беларусізацыі адгукнуўся і рэдактар часопіса "Крывіч" з Коўна Вацлаў Ластоўскі [1, с. 220].

Пад ціскам неспрыяльных абставін, звязаных са спыненнем фінансавання выдавецтва часопіса "Крывіч" і палітычным пераваротам 17 снежня 1926 г. у Літве, у красавіку 1927 г. В. Ластоўскі пераехаў у сталіцу БССР г. Мінск. Разам з ім адбылі ў Мінск яго старэйшая дачка з мужам – літоўскім камуністам, а жонка з малодшай дачкой засталіся ў Літве [11, с. 241].

У Мінску Ластоўскі працаўладкаваўся дырэктарам Беларускага дзяржаўнага музея і адначасова загадчыкам кафедры этнаграфіі пры Інбелкульце. Ён таксама актыўна працаваў разам з Я. Лёсікам, Я. Купалам і іншымі навукоўцамі ў камісіі па ахове помнікаў старажытнасцяў у БССР, планаваў падрыхтаваць да друку альбом беларускага народнага арнамента. Пад ягонай рэдакцыяй пачалі

выходзіць этнаграфічныя зборнікі. Ён узначальваў этнаграфічныя экспедыцыі ў розныя рэгіёны рэспублікі. Падчас адной такой экспедыцыі быў вывезены ў Мінск з Полацка крыж Ефрасінні Полацкай, зроблены Лазарам Богшай.

У 1926 г. Ластоўскі В.Ю. быў абраны членам-карэспандэнтам Украінскай акадэміі грамадазнаўства, а ў канцы 1928 г. Савет Народных камісараў БССР у знак прызнання выдатных заслуг перад беларускай навукай зацвердзіў яго ў званні акадэміка Акадэміі навук БССР. "Аб тым, што Вацлаў Ластоўскі быў вучоным–энцыклапедыстам, сведчыць яго фундаментальная праца "Гісторыя беларускай (крыўскай) кнігі", надрукаваная ў 1926 г.". – адзначаў Язэп Янушкевіч [9, с. 42-43].

У 1929-1931 гг. шэрагі грамадазнаўцаў былі значна аслаблены арыштамі вядомых вучоных: гісторыка У. Пічэты, географа А.Смоліча, эканаміста-географа М. Гарэцкага і інш. Жорсткі ідэалагічны ўціск давёў да самагубства першага прэзідэнта Акадэміі навук БССР У. Ігнатоўскага. [11, с. 310]. Толькі за адну ноч з 18 на 19 ліпеня 1930 г. было арыштавана 25 чалавек. Сярод заключаных ва ўнутраную турму ГПУ Беларусі былі Максім Гарэцкі, Язэп Дыла, Фларыян Ждановіч, Уладзімір Пракулевіч, Іван Цвікевіч і іншыя [11, с. 205].

Пастановай Савета Народных Камісараў БССР ад 20 лістапада 1929 г. В. Ластоўскі быў вызвалены ад пасады вучонага сакратара Беларускай Акадэміі Навук, а 21 ліпеня 1930 г., калі ён разам з акадэмікам С. Некрашэвічам знаходзіўся ў навуковай камандзіроўцы ў Томску, быў затрыманы на параходзе "Табольск" па справе "Саюза вызвалення Беларусі", хаця пастанова і ордэр на арышт былі падпісаны яшчэ 18 ліпеня. У тую ж ноч з 18 на 19 ліпеня ў яго кватэры ў Мінску супрацоўнікі ГПУ БССР зрабілі вобыск. Яны забралі, як было адзначана ў пратаколе вобыску, 35 экзэмпляраў часопіса "Крывіч", усю перапіску, а таксама "рукопись Ластовского и других авторов на 731 листах и полулистах" [17, с. 20].

У Томску В. Ластоўскі доўга не затрымаўся. Адсядзеўшы ў турме некалькі дзён, ён быў этапіраваны ў Мінск, дзе 1 жніўня 1930 г. яму пад распіску аб'явілі пастанову аб заключэнні пад варту, а праз 15 дзён другую – аб прыцягненні да следства ў якасці абвінавачваемага ў прыналежнасці да нелегальнай

контррэвалюцыйнай арганізацыі. Але сама назва арганізацыі – “Саюз вызвалення Беларусі” – спачатку яшчэ не фігуравала ў следчых матэрыялах В. Ластоўскага [17, с. 206].

Больш паўгода вялося следства і толькі 19 лютага 1931 г. было аб’яўлена аб яго заканчэнні. За гэты час Ластоўскага шмат разоў дапытвалі. Вынікі допытаў былі афармлены своеасабліва – былы прэм’ер БНР уласнай рукой выклаў на паперы ўсё, аб чым ішла размова ў кабінетах следчых. Такія паказанні атрымалі назву ўласнаручных. І таму давер да таго, што напісана ўласнаручна, лічыўся непараўнальна большым, чым да таго, дзе стаіць подпіс: “Запісана з маіх слоў верна, мною прачытана”.

6 снежня 1930 г. пастановай СНК БССР Ластоўскі быў пазбаўлены звання акадэміка, а 10 красавіка 1931 г. асуджаны да высылкі на 5 год за межы БССР у г. Саратаў. Там ён працаваў загадчыкам аддзела рэдкіх кніг і рукапісаў бібліятэкі Саратаўскага ўніверсітэта.

20 жніўня 1937 г. ён зноў быў арыштаваны і 156 сутак знаходзіўся ў турме. Выязная сесія Вайсковай Калегіі Вярхоўнага суда СССР 23 студзеня 1938 г. на зачыненым судовым паседжанні без наяўнасці адваката і сведкаў разгледзела справу Ластоўскага В.Ю. і вынесла прысуд – вышэйшую меру пакарання як “ ворагу народа”, “агенту польскай разведкі і ўдзельніку нацыянал-фашысцкай арганізацыі”. У той жа дзень 23 студзеня 1938 г. Ластоўскага В.Ю. растралялі [11, с. 254, 264].

Яго навуковыя працы былі канфіскаваны. 10 чэрвеня 1988 г. з-за адсутнасці складу злачынства першая крымінальная справа ў адносінах да В. Ластоўскага была спынена Вярхоўным судом БССР, а другая – 16 верасня 1988 г. Ваеннай калегіяй Вярхоўнага суда БССР. У 1990 г. ён быў адноўлены ў званні акадэміка [11, с. 242].

Так скончылася жыццё знакамітага самародка беларускай зямлі, першапраходца гісторыі, адраджэнца беларускай дзяржаўнасці. Ён зрабіў усё, “каб Беларусь перастала быць краем, невядомым для саміх беларусаў” і народаў свету. Шматбаковая, актыўная дзейнасць В.Ю. Ластоўскага як публіцыста, пісьменніка і навукоўца мела і мае вялікае пазнавальнае і выхаваўчае значэнне. У яго кнігах, падручніках на вышэйшым філасофскім, навуковым узроўні асэнсавана паняцце нацыянальнай самасвядомасці. Як і большасць яго паплечнікаў-адраджэнцаў, ён ставіў пытанне пра нацыянальную

школу ў поўным сэнсе гэтага слова, уключаючы і дэмакратызацыю, гуманізацыю школьнай справы, абавязковае выкладанне на роднай мове, выхаванне ў вучняў высокароднага пачуцця патрыятызму.

Вялікая заслуга В. Ластоўскага ў тым, што ён многае зрабіў па аднаўленню гістарычнай памяці, сінтэзаванню мінулага педагагічнага вопыту і значна ўзбагаціў яго асабістымі аўтарскімі знаходкамі, нацыянальна-гістарычным каларытам, шэрагам навукова-педагагічных ідэй. Стварэнне і развіццё нацыянальнай асветы і школы ён звязваў з гістарычнай адукацыяй, багатай народнай творчасцю беларусаў і выкладаннем на іх роднай мове.

“Найбольш сілы мае той народ, – пісаў В. Ластоўскі, – каторы патрапіў усіх сваіх членаў злучыць у адно, дзе ўсе думаюць і пачуваюць як адзін  чалавек, а кожны – так, як усе; аднак такую гарманічную цэласць, што аддзельныя асобы могуць найшырэй выявіць усе свае асаблівасці, усю арыгінальнасць сваёй творчасці” [6, с. 244]. Ён лічыў, што вядомыя ў гісторыі захопніцкія войны – гэта, па сутнасці, агрэсіўнае пашырэнне стылю жыцця адной нацыі на быццё і культуру іншых плямёнаў, народаў і нацый. Раней мацнейшыя дзяржавы з гэтай мэтай вынішчалі слабейшых, цяпер жа яны імкнуцца дэнацыяналізаваць іх, уніфікаваць паводле свайго стылю і ладу жыцця, свае мовы і культуры.

У наш час, вядома, не з усімі поглядамі В. Ластоўскага можна пагадзіцца, не ўсе яго гіпотэзы дастаткова абгрунтаваныя, навукова даказанныя, а мары здзейсненыя. Але гэта не павінна перашкаджаць нам бачыць у яго асобе таленавітага даследчыка, мысляра, плённая дзейнасць якога заўчасна перапынена. Гэта асоба шматгранная: паэт і празаік, этнограф і палітычны дзеяч, педагог і філолаг, журналіст і арганізатар навукі. Яго творы ўведзены ў школьныя праграмы і гэта гарантыя таго, што юныя грамадзяне Рэспублікі Беларусь будуць ведаць гэтага Беларуса з вялікай літары, які даказаў сваімі працамі самабытнасць беларускай культуры і мовы, слаўнай гістарычнай спадчыны. Ён найперш імкнуўся, каб і яго народ заняў “пачэсны пасад між народамі” [18, с. 90]. Сваім прыкладам ён нібы заклікае нас, сённяшніх, не спыняцца перад нязведанным, шукаць вырашэння няпростых, праблемных пытанняў і сітуацый.

Навуковая спадчына В. Ластоўскага можа з вялікай аддачай выкарыстоўвацца і ў нашы дні. Яна дапамагае кожнаму маладому чалавеку выпрацаваць свой нацыянальны ідэал, заснаваны на

багатых гістарычных і духоўных традыцыях, выдатных постацях, глыбока ўсведаміць значэнне бессмяротных каштоўнасцяў мінуўшчыны і разумна дапасаваць іх да сучаснага жыцця. Ён лічыў, што толькі ў еднасці, добрасуседстве, вернасці лепшым нацыянальным традыцыям, любові да сваёй мовы, гісторыі, далучанасці да еўрапейскай, сусветнай цывілізацыі наша духоўная моц і выратаванне.

Выкарыстаная літаратура


1. Беларусь: Энцыкл.даведнік. / Беларус. энцыкл.; Рэд. калегія Б.І. Сачанка (Гал. рэд) і інш.; Маст. М.В. Дpако, А.М. Хількевіч, Мінск: Беларуская Энцыклапедыя, 1995. – 800 с.

2. Хто такі Вацлаў Ластоўскі // 100 пытанняў і адказаў з гісторыі Беларусі / Уклад. і прадм. І. Саверчанка, З. Санько. – Мінск: Навука і тэхніка, 1994. – 190 с.

3. Ластоўскі, В.Ю. Кароткая гісторыя Беларусі. / В.Ю. Ластоўскі. – Мінск: Універсітэцкае, 1992.– 126 с.

4. Голубеў, В.Ф. і інш. Ці ведаеце Вы гісторыю сваей краіны? / В.Ф. Голубеў, У.П. Крук, П.А. Лойка. –Мінск: Народная асвета, 1994. – 135 с.

5. Вяртання маўклівая споведзь. Постаці творчай беларускай гісторыі ў кантэксце часу. – Мінск: Вышэйшая школа, 1994. – 318 с.

6. Яўрэйская культура Беларусі і яе ўзаемадзеянне з беларускай і іншымі культурамі; Вацлаў Ластоўскі – выдатны дзеяч беларускага адраджэння: Беларусіка. / рэд. Рагойша, Г. Цыхун, З. Шыбека. – Мінск: Навука і тэхніка, 1995. – 382 с.

7. Ластоўскі В. Што трэба ведаць кожнаму беларусу / В. Ластоўскі. – выд. 3, – Мінск, 1991.

8. Полымя – 1994 – № 5. – С 148-172.

9. Спадчына – 1993 – № 5. – С. 42, 43.

10. Арлоў, Уладзімір, Сагановіч, Генадзь. Дзесяць вякоў беларускай гісторыі (862-1918). Падзеі. Даты. Ілюстрацыі / У. Арлоў, Г. Сагановіч. – Вільня, “Наша Будучыня”, 2000. – 222 с.

11. Сыны і пасынкі Беларусі. – Мінск: Полымя, 1996. – 416 с.

12. Спадчына. – 2001. – № 3. – С. 153-155.

13. Роднае слова. – 1995. – № 4. – С. 158-160.

14. Купала, Я. Поўны збор твораў: у 9 т. Т. 2 / Я. Купала. –Мінск, 1996. – 132 с.

15. Роднае слова. – 2003. – № 3. – С .6-7.

16. Роднае слова. – 2003. – № 10. – С .6-7.
17. Маладосць. – 1993. – № 8. – С. 203-209.
18. Цэнтр. навук. бібл. НАН Беларусі, Ф.23, Воп.1, Спр.67, Арк.1.
19. З гісторыяй на ”Вы”: артыкулы, дакументы, успаміны. – Мінск: Мастацкая літаратура, 1994. – 351 с.
20. Роднае слова. – 1996. – № 3. – С. 90-93.
21. Неман. – 1988. – № 9. – С. 156-163.

## ПЛАН СТВАРЭННЯ БЕЛАРУСКА-ЛІТОЎСКІХ ВАЙСКОВЫХ ФАРМІРАВАННЯЎ І ІХ ДЗЕЙНАСЦЬ У 1918-1923 гг.

Багалейша С.В., кандыдат гістарычных навук, дацэнт

Агульнавядома, што ні адна нацыя не ў стане дасягнуць незалежнай дзяржаўнасці без стварэння ўласных узброеных сілаў. У гады Першай сусветнай вайны пэўныя захады ў гэтым накірунку рабілі і беларускія нацыянальна-свядомыя дзеячы. Аднак, падчас нямецкай акупацыі урад БНР не здолеў стварыць сваю збройную сілу. З нагоды гэтага, беларускія дзеячы пайшлі на больш цеснае вайсковае супрацоўніцтва з літоўскім урадам і гэта з’явілася адным з накірункаў беларуска-літоўскіх узаемаадносін у 1918-1923 гг.

Гэтае пытанне вельмі слаба раскрыта ў нашай навуковай гістарычнай літаратуры, ёсць толькі некаторыя фрагменты і эпізоды, якія датычацца азначанай праблемы.

Беларускія вайсковыя часткі ў Літве адыгралі значную ролю ў абароне незалежнасці і тэрытарыяльнай цэласнасці нашай Радзімы – Беларусі і толькі неспрыяльная гістарычная сітуацыя не дала ім магчымасці разгарнуцца ў войска, якое б не на словах, а са зброяй у руках абараняла родную зямлю ад чужынцаў.

27 лістапада 1918 г. паміж урадам БНР і літоўскай Тарыбай (урадам Літвы) быў заключаны дагавор аб супрацоўніцтве. Адной з умоў дамовы і было стварэнне беларускіх вайсковых фарміраванняў у Літве [1, с. 297-298]. Дзеля гэтага ўтваралася Міністэрства беларускіх спраў пры літоўскім урадзе, якое павінна было кантраляваць фарміраванне беларускіх вайсковых адзінак у Літве. Унутры Міністэрства ствараўся вайсковы сакратарыят, асноўнымі функцыямі якога былі: фарміраванне беларускіх вайсковых частак,